

ддзялення
ўны,
ымаць
ца ў

акладнас-
шыністам
лоўцы па
— кажа
лужыў у
ётнага
мя ка-
у нас
спра-
усяў».
гня-
атні
ой
о

# Бібліятэка сябруе з Саюзам пісьменнікаў

Каштоўнасць бібліятэк нельга вызначыць ні ў грашовых адзінках, ні ў унцыях, ні ў каратах. Тут скарбы не схаваны ад людскіх вачэй — ідзі, выбірай і карыстайся. У разумных кнігах адказы на ўсе хвалюючыя пытанні. Жыліцкая бібліятэка размясцілася ў палацы пана Булгака. На яе паліцах больш за 20 тысяч кніг. Сюды прыходзяць 550 чытачоў рознага ўзросту. А гаспадараць у гэтым царстве дзве цудоўныя супрацоўніцы: загадчыца Таццяна Мікалаеўна Васількова і бібліятэкар Святлана Іванаўна Амельчанка. Пастаянныя партнёры ўстановы, яе памочнікі — мясцовыя гістарычны комплекс-музей, дзіцячая школа мастацтваў, дзіцячы сад — сярэдняя школа.

Работа з чытачамі вельмі крапатлівая і аб'ёмная, патрабуе прафесіяналізму, увагі, цярплівасці. Мы садзейнічаем захаванню праўдзівай гістарычнай памяці, традыцый продкаў, выхаванню пачуццяў любові, годнасці, гонару і павагі да культуры, узбагачэнню культурнай, гістарычнай і літаратурнай спадчыны нашага народа, фарміраванню культуры выбару.

Бібліятэка сябруе з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. На паліцах кнігі-падарункі з аўтографамі Мікалая Чаргінца, Міхася Пазнякова, Уладзіміра Саламахі, Ганада Чарказяна, Вольгі Паўлючэнка, Якава Аляксейчыка ды іншых. Ёсць кніга «Возвращусь в Беларусь я стихами» Р. Айзенштата, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, жыхара Ізраіля. Часткай яе з'яўляецца «Белорусская тетрадь» — ода беларускаму чалавеку, яго шчырасці, дабраце, зямлі, прыродзе. Сувязь з Саюзам пісьменнікаў аформілася ў завочную літаратурную сустрэчу-аўтограф і вусны часопіс «Я вечны парастак Радзімы».

У Год гістарычнай памяці ў бібліятэцы арганізаваны кніжна-ілюстрацыйныя выставы «Ствараць будучае, помнячы аб мінулым», «Без тэрміну даўніны» — аб генацыдзе нашага народа ў гады вайны, «Любімы горад на Дняпры» — да 750-годдзя з дня заснавання Магілёва, «Алмаз ведаў» — да 100-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, «Зорны свет песняроў» — да юбілеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа, віртуальная выстава «Беларусь, Радзіма. Адзінства».

Бібліятэкары таксама праводзяць для мясцовых жыхароў масавыя мерапрыемствы, якія выхоўваюць патрыятызм і любоў да роднага краю. Дзень памяці ахвяр Халакосту стаў днём правядзення мітынгу-рэквіема каля мемарыяльнага камня загінуўшым яўрэям. Зацікавіў чытачоў і рэтрапогляд «Палац Булгака ў малюнках Напалеона Орды». У рамках дня роднай мовы прайшлі акцыі «Слова жывое, роднае, гаваркое», «Чытаем па-беларуску,» «Час размаўляць на роднай мове». Вялікая работа вядзецца і ў сацыяльных сетках «Одноклассники» і «ВКонтакте». Бібліятэка прымае ўдзел у міжнародных анлайн-акцыях. Чытачы рознага ўзросту ўдзельнічаюць у марафонах, флэшмобах, прысвечаных дзяржаўным святам.

Што задумана на бліжэйшы час? Дыялогавая пляцоўка «Мы адзіныя, мы моцныя», актуальны дыялог «Зямля без вайны», фотаакцыя «Я жыву на вуліцы Аляксандра Ядлоўскага» (загінуў смерцю героя ў Афганістане).

Галоўнае, лічаць бібліятэкары, каб сабраны матэрыял у інфармацыйных папках аб земляках — удзельніках вайны, знакамітасцях роднага краю, летапіс аграгарадка Жылічы стаў унёскам у патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення.

**Валянціна ГЕРАСІМАВА**, жыхарка аграгарадка Жылічы Кіраўскага раёна